Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

DOI:10.17951/sb.2016.10.323
Studia Białorutenistyczne 10/2016

Ганна Кісліцына, *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў*, Мінск: Права і эканоміка, 2015, 344 с.

Невялікім накладам у 100 асобнікаў у прыватным мінскім выдавецтве „Права і эканоміка" пабачыла свет манаграфія, вельмі важная для сучаснага беларускага літаратуразнаўства. Важная, па-першае, таму, што ў Беларусі ў адрозненне ад Польшчы ці Расіі надзвычай рэдка з'яўляюцца навуковыя даследаванні, прысвечаныя найноўшай літаратуры, а, па-другое, таму што напісана гэта кніга адной з самых яскравых прадстаўніц крытычнага цэху, якая спалучае занятак крытыкай і вядзенне прыватнага блога ў інтэрнэце з навуковай працай у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Што праўда, да гэтага часу не вырашана пытанне: ці можа крытык быць адначасова літаратуразнаўцам, а прафесійны літаратуразнаўца займацца крытыкай? У многіх заходнееўрапейскіх краінах гэтыя віды дзейнасці строга размежаваныя і калі літаратурны крытык адважыцца ўсё ж такі займацца навукай, то выбірае прадметам свайго навуковага даследвання гісторыю літаратуры, а не яе сучасны стан. Такое размежаванне вынікае са светапоглядной і стылёва-метадалагічнай апазіцыі паміж незалежнай часопіснай крытыкай і акадэмічна-ўніверсітэцкай навукай, якая старанна падкрэсліваецца прадстаўнікамі абодвух асяродкаў. Але ў Беларусі падобная апазіцыя не склалася (ва ўсякім разе пакуль), таму для прафесійнага літаратуразнаўцы не з'яўляецца нечым дзіўным займацца бягучай крытыкай, а многія крытыкі маюць навуковыя ступені.

У выпадку Ганны Кісліцынай прыхільнікі і непрыхільнікі сумяшчэння крытычнай дзейнасці і літаратуразнаўчай прафесіі маюць выключна цікавы прыклад сітуацыі.

Манаграфія *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў* напісана як падстава доктарскай дысертацыі (габілітацыі), паспяхова абароненай у 2015 г. Кандыдацкая дысертацыя Ганны Кісліцынай была прысвечана паэзіі Алеся Разанава, а 1997 г. у акадэмічным выдавецтве „Беларуская навука" пабачыла свет кніга *Алесь Разанаў: праблема мастацкай свядомасці* – першая манаграфія пра гэтага адметнага паэта. У 2000 г. у тым самым выдавецтве з'явілася наступная манаграфія Ганны Кісліцынай – *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*. Абедзве манаграфіі былі напісаныя на высокім навуковым узроўні, выявілі сур'ёзную тэарэтычную падрыхтоўку і несумненныя аналітычныя здольнасці маладой даследчыцы. Праўда, паралельна з навуковай дзейнасцю Ганна Кісліцына публікавала эма-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

цыянальна-дыскусійныя артыкулы пра найноўшую беларускую літаратуру ў часопісах „Крыніца", „Калосьсе", „Arche", удзельнічала ў літаратурных тусоўках і імпрэзах „Тутэйшых", „ТВЛаўцаў", „Бум-Бам-Літаўцаў", а ў 2003 г. апублікавала ў незалежным выдавецтве „Логвінаў" зборнік артыкулаў *Blonde attack*, які замацаваў за ёй рэпутацыю моднага крытыка з феміністычным ухілам.

Нейкі час Ганна Кісліцына паспяхова існавала ў двух паралельных светах: акадэмічнай навукі і літаратурнай крытыкі, але ў 2006 г. здарыўся „інцэст": выйшла манаграфія *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы*. Кніга пабачыла свет у незалежным выдавецтве „Логвінаў" у авангарднай серыі „Другі фронт мастацтваў", але пад грыфам „Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Ордэна дружбы народаў Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы". Навуковым рэдактарам манаграфіі, асноўная ўвага ў якой прысвечана неканонізаваным яшчэ аўтарам – Адаму Глобусу, Ігару Сідаруку, Зміцеру Вішнёву, Еве Вежнавец і інш. – быў пазначаны доктар філалагічных навук В. П. Жураўлёў, а рэцэнзентамі – доктар філалагічных навук М.В. Хаўстовіч (спецыяліст па гісторыі беларускай літаратуры XIX ст.) і доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М.І. Мушынскі (спецыяліст па гісторыі беларускай літаратуры першай трэці XX ст.). Абапіраючыся на канцэпцыі В. Акудовіча і С. Дубаўца, Ганна Кісліцына напісала першае сістэмнае даследаванне пра „новую" беларускую літаратуру: пра грамадска-палітычныя і эстэтычныя змены канца XX – пачатку XXI ст., пра літаратурныя суполкі „Тутэйшыя", „Таварыства вольных літаратараў", „Бум-Бам-Літ", пра ўзмацненне феміністычнага дыскурсу і дыфузію літаратурных жанраў. На жаль, каштоўнасць гэтага наватарскага даследвання зніжалі празмерная эмацыянальная заангажаванасць аўткрі, праяўленне яе асабістых сімпатый–антыпатый да таго ці іншага пісьменніка ў ацэнцы яго творчасці. Кніга *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы* як бы „завісла" паміж крытыкай і літаратуразнаўствам, уяўляла сабой ці то зборнік артыкулаў (пра літаратурна-мастацкія суполкі, пра феміністычны дыскурс у беларускай літаратуры, пра дыфузію жанраў) ці то цэльную манаграфію, у якой, на жаль, адсутнічаў агульны спіс бібліяграфіі напрыканцы кнігі і паказальнік імёнаў. Трэба дадаць, што кніга выклікала шэраг крытычных водгукаў у друку (найперш згадваецца артыкул Юрася Пацюпы *Пра кавалерысцкі наезд на пісьменніцкім хутары*, „Arche" 2006, №11, с. 160–168).

Пасля 2006 г. Кісліцына–літаратуразнаўца публікуе некалькі прац у калектыўных акадэмічных манаграфіях (у тым ліку – аналіз стану сучаснай беларускай крытыкі), выдае кнігу *Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры* (Мінск; „Права і эканоміка" 2010) і ўрэшце ў 2015 г. з'яўляецца манаграфія *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў*, якую можна разглядаць і як новае сістэмнае даследаванне, і як дапрацаваную кнігу выбраных навуковых прац аўтаркі, аб'яднаных агульнай тэмай.

У анатацыі да кнігі тлумачыцца вынесенае ў загаловак паняцце „градыент", запазычанае з дакладных навук:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

> Градыент – характарыстыка, якая паказвае напрамак найхутчэйшага ўзрастання функцый. У кнізе разглядаюцца тыя працэсы, якія змянілі беларускую культуру ў апошняй чвэрці стагоддзя. Аб'ектам увагі сталі самыя цікавыя з'явы сучаснага літпрацэсу, знакавыя мастацкія тэксты і маніфесты літаратурных суполак, а таксама крытычныя артыкулы і дыскусіі, якія з'яўляюцца на старонках беларускіх газет і часопісаў. Аўтар аналізуе творы як жывых класікаў літаратуры, так і тых, каго сёння называюць „пакаленнем нулявых". Даследчык спрабуе акрэсліць супярэчлівы вобраз сучасніка на матэрыяле самых яркіх прадстаўнікоў беларускай прозы канца XX ст. – пачатку XXI ст. (с. 2).

„Культурны градыент" – гэта напрамак, у якім змяняецца культура, такім чынам, аб'ектамі даследавання зноў выступаюць „змена культурнай парадыгмы" і „новая літаратурная сітуацыя" як адзін з яе вынікаў. Вынесены ў загадовак кнігі тэрмін амаль не ўжываецца на яе старонках, затое паняцце „культурная парадыгма" і „новая літаратурная сітуацыя" сустракаюцца вельмі часта і нават вынесены ў назвы раздзелаў і падраздзелаў.

Структура манаграфіі выглядае наступным чынам. У невялікіх *Уводзінах* аўтарка слушна адзначае, што ў той час, калі літаратуразнаўцы суседніх краін бралі актаўны ўдзел у фарміраванні і асэнсаванні новых з'яў літаратуры, беларускія даследчыкі прыкметна адставалі, называе і коратка характарызуе нешматлікія працы пра сучасную беларускую літаратуру на англійскай, беларускай і польскай мовах (А. Макміліна, А. Бельскага, А. Бязлепкінай, К. Бартноўскай), адзначае, што „прастой" беларускага літаратуразнаўства ў асэнсаванне новых мастацкіх з'яў кампенсавала літаратурная крытыка (С. Дубавец, Л. Сінькова, П. Васючэнка, І. Шаўлякова і інш.) і акрэслівае мэту свайго даследавання:

> […] грунтоўна і цэласна прааналізаваць тыя літаратурна-мастацкія з'явы, якія складаюць сутнасць паняцця Новая літаратурная сітуацыя, вылучыць яе асаблівасці і агульныя заканамернасці, але найперш легітымізаваць гэтае паняцце як тэрмін, што характарызуе змены, якія адбыліся ў нацыянальнай літаратуры ў выніку грамадска-палітычнай трансфармацыі 1985–1990-х гадоў, а таксама як абазначэнне часовага адрэзка з 1985 па 2010 год (с. 12).

Першы раздзел *Змена культурнай парадыгмы* мае тры падраздзелы: *Змена культурнай парадыгмы: тэарэтычны аспект*, *Новая літаратурная сітуацыя: сацыяльныя перадумовы*, *Эстэтычныя прынцыпы Новай літаратурнай сітуацыі ў люстэрку беларускай крытыкі*. Фактычна, гэта дапрацаваны на больш высокім тэарэтычным узроўні (усё ж такі мінула амаль дзесяць гадоў) раздзел *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы* з манаграфіі 2006-га года з дадаткам арыгінальнага падраздзелу пра беларускую крытыку.

Да манаграфіі 2006-га года ўзыходзіць і другі раздзел пад назвай *Літаратурныя аб'яднанні 1990-х гадоў: эстэтычныя маніфесты, ідэі, мастацкія прыёмы* з трыма падраздзеламі: *„Тутэйшыя": гісторыя, маніфесты, постаці*, *Тавары-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

ства Вольных Літаратараў: пераемнасць, маніфесты, асобы, *„Бум-Бам-Літ”: стварэнне, маніфесты, персаналіі*. Раздзел гэты таксама істотна дапрацаваны, але не столькі ў тэарэтычным плане, колькі ў фактаграфічным. Ганна Кісліцына выкарыстоўвае дакументальныя матэрыялы з Беларускага дзяржаўнага архіва–музея літаратуры і мастацтва: Пратакол паседжання сакратарыята СП БССР №8 ад 15 лютага 1988 г., Пратакол паседжання сакратарыята СП БССР №19 ад 16 мая 1988 г., Пратакол сумеснага паседжання партыйнага бюро і сакратарыята праўлення СП БССР №32 ад 16 мая 1988 г., Стэнаграму пленума праўлення СП БССР ад 8 снежня 1988 г. і інш. Выкарыстанне архіўных матэрыялаў прыкметна ўзвышае навуковую вартасць раздзела, прысвечанага літаратурным суполкам 1990-х гадоў як і манаграфіі ў цэлым.

Трэці раздзел пад назвай *Заканамернасці развіцця літаратурнага працэсу на мяжы XX–XXI стагоддзяў* складаецца з двух падраздзелаў: *Ідэйна-мастацкія асаблівасці беларускай літаратуры 1990-х: дыфузія жанраў* і *Маральна-эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры 2010-х гадоў: спасціжэнне свету і чалавека*. Першы падраздзел амаль даслоўна паўтарае аналагічны падраздзел *Новая літаратурная сітуацыя: дыфузія жанраў* з манаграфіі 2006-га года, а другі ўзыходзіць да пазнейшых даследаванняў аўтаркі (*Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры* і інш.), але фрагментарна выкарыстаны і падраздзел *Феміністычны дыскурс у сучаснай беларускай літаратуры* з ранейшай манаграфіі. Падраздзел пра маральна-эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры 2010-х гадоў адрозніваецца ад іншых раздзелаў манаграфіі не толькі сваім аб’ёмам (100 старонак), але і сваёй актуальнасцю, адсутнасцю часавай адлегласці паміж аўтарам і прадметам даследавання. Калі арганізацыйную дзейнасць і творчасць літаратурных суполак 80–90-хх гг. мінулага стагоддзя можна ўжо разглядаць як гісторыю літаратуры, то паэзія і проза 2010-х гадоў ствараецца на нашых вачах і з’яўляецца непасрэдным аб’ектам увагі бягучай літаратурнай крытыкі.

У *Заключэнні* Ганна Кісліцына падводзіць высновы свайго даследавання, слушна сцвярджае, што:

> […] літаратурна-мастацкія працэсы, якія садзейнічалі ўсталяванню новай літаратурнай сітуацыі, не былі справакаваны звонку, а сталі заканамерным вынікам развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, у якім сёння ранейшыя мастацкія мадэлі суіснуюць з постмадэрнісцкімі ўзорамі пісьма (с. 323).

Адзначым асобныя недахопы манаграфіі *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў*, якія ў многім тлумачацца якраз суіснаваннем у асобе Ганны Кісліцынай даследчыка–навукоўца і літаратурнага крытыка.

Нам ужо даводзілася пісаць пра рэцэпцыю дзейнасці і творчасці „Тутэйшых” у манаграфіі Г. Кісліцынай 2006-га года (С. Кавалёў, *Прэпараванне міфа: таварыства „Тутэйшыя” ў люстэрку крытыкі*, „Дзеяслоў” 2013, №2 (63), с. 307–320).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

На жаль, ніводная з заўваг не ўлічана аўтаркай пра падрыхтоўцы новай кнігі. Зноў сустракаюцца экспрэсіўныя ацэнкі і эмацыянальна-афарбаваныя выказванні, недамесныя [недарэчныя] ў навуковай працы, накшталт: „Іх сённяшняя ацэнка мэт і стратэгій „Тутэйшых" у многім прадвызначана роўнасцю ўласнага творчага шляху, які ім забяспечыла адданасць усталяванаму літаратурнаму канону, развіццю і ўзмацненню якога яны плённа служылі і служаць" (с. 79). Не ўлічаны Г. Кісліцынай некаторыя важныя публікацыі, прысвечаныя літаратурна-мастацкім аб'яднанням канца XX ст. і іх удзельнікам (напрыклад, артыкул Ігара Жука *Камуляцыя і катастрофа: беларускі варыянт развязвання сітуацыі* [у:] *Новае слова ў літаратуразнаўстве і фальклярыстыцы*, пад рэд. І. Багдановіч, Мінск, 2012, с. 103–110; успаміны Алеся Бяляцкага *Трагедыя Толіка Сыса,* „Наша Ніва", 14.10.2005). Не салідна ў навуковай манаграфіі, выдадзенай пад грыфам „Нацыянальная акадэмія навук Беларусі", цытаваць маніфест „Тутэйшых" па іншай манаграфіі: кнізе Аксаны Бязлепкінай *Разам і паасобку: таварыства „Тутэйшыя* (Мінск, 2003), а вось паказальнік імёнаў у такой манаграфіі вельмі прыдаўся б і аблегчыў жыццё маладым даследчыкам, якія несумненна будуць звяртацца да працы Ганны Кісліцынай.

У анатацыі да манаграфіі пазначана, што аўтарка разам з творамі маладых пісьменнікаў аналізуе творы „жывых класікаў беларускай літаратуры". Не вельмі зразумела, хто маецца на ўвазе. Што праўда на сс. 266–280 аналізуюцца прыпавесці Васіля Быкава, але гэты выдатны пісьменнік ужо памёр, а называць класікамі іншых герояў кнігі Ганны Кісліцынай – пры ўсёй нашай да іх павазе – пакуль не выпадае (ва ўсякім разе ў навуковай манаграфіі). Разглядаючы маральна-эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры 2010-х гадоў, Г. Кісліцына абапіраецца на празаічныя творы такіх адметных аўтараў, як Адам Глобус, Юры Станкевіч, Андрэй Федарэнка, Людміла Рублеўская, Алесь Наварыч і інш. Але выклікае здзіўленне адсутнасць увагі да твораў Віктара Казько, Уладзіміра Някляева, Альгерда Бахарэвіча і некаторых іншых вядомых празаікаў. І чаму праблема даследуецца толькі на матэрыяле прозы, калі падраздзел мае назву *Маральна-эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры 2010-х гадоў: спасціжэнне свету і чалавека*?

Манаграфія Ганны Кісліцынай *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў* нараджае многія пытанні і выклікае жаданне падыскутаваць з некаторымі высновамі даследчыцы. І ў гэтым – адна з галоўных каштоўнасцяў кнігі, у якой навідавоку жывая, арыгінальная думка аўтаркі, яе ўменне асэнсаваць модныя тэорыі і ідэі замежных даследчыкаў і прыстасаваць іх на айчыннай глебе альбо адкінуць як чужыя і штучныя. Ганна Кісліцына – адна з нешматлікіх беларускіх літаратуразнаўцаў, якая насамрэч умее тэарэтызаваць у сваіх працах, а не толькі карыстацца мудрагелістымі, „наукообразными" тэрмінамі.

У прадмове да кнігі Ганна Кісліцына згадвае калектыўную акадэмічную *Гісторыю беларускай літаратуры XX стагоддзя* (т. 4, кніга 2) і адзначае: „*Гісторыя* істотна паўплывала на інтэрпрэтацыю літаратурных падзей гэтага перыяду,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 12:22:20

сфарміраваўшы пэўны *літаратурны канон*, за межы якога мала хто з беларускіх даследчыкаў выходзіў пасля" (с. 5).

Дазволю сабе не пагадзіцца з шаноўнай аўтаркай і досыць крытычна ацаніць *Гісторыю беларускай літаратуры XX стагоддзя* (т. 4, кнігі 2 і 3) і прапанаваны гэтым акадэмічным выданнем канон сучаснай беларускай літаратуры. У манаграфіі *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў* Ганна Кісліцына смела выходзіць за межы гэтага канону, па-іншаму ацэньвае многія мастацкія з'явы, аперыруе зусім іншымі імёнамі і творамі, непрызнанымі пакуль афіцыйным беларускім літаратуразнаўствам, і ў гэтым галоўная каштоўнасць і наватарства яе даследавання.

Сяргей Кавалёў